

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Ліда, 2021 г.*

## *БЛАНК ЗАДАННЯЎ*

*Дарагія дзесяцікласнікі!*

*У гэтым навучальным годзе споўнілася б 100 гадоў класіку беларускай драматургіі Андрэю Макаёнку. З яго творчасцю вы пазнаёміцеся пазней, а сёння мы адправімся ў вандроўку па незвычайнай і таямнічай краіне тэатра.*

**10 клас**
**Варыянт 2**

**Заданне 1.** Прачытайце тэкст і выканайце заданні да яго.

*Максімальная колькасць балаў –* **6.**

*Тэатразнаўства – гэта самастойная навука, якая вывучае паходжанне і развіццё тэатра, яго месца і ролю ў грама(дс,ц)тве, сучасны тэатральны працэс. Зыходзячы з таго, што ка(м,мм)унікатыўны ланцужок тэатральнага працэсу складаецца з драматургіі, сцэнічнага мастацтва, гл(е,я)дача, тэатральнай крытыкі і тэатразнаўства, кожная з гэтых (сістэмна)абгрунтаваных частак з'яўляецца прадметам дасле(д,да)вання і вывучэння адпаведных раздзелаў навукі аб тэатры.*

| | |
|---|---|
| А | Размяркуйце наступныя словы па слупках у табліцы: *з'яўляецца, развіццё, зыходзячы, раздзелаў, самастойная, складаецца, мастацтва*. |
| Б | Запішыце правільна наступныя словы, раскрыўшы дужкі: *ка(м,мм)унікатыўны, грама(дс,ц)тве, (сістэмна)абгрунтаваных, гл(е,я)дача, дасле(д,да)вання*. |

**Заданне 2.** Як вядома, акцёр у тэатры можа выконваць самыя розныя ролі – гераічныя, драматычныя, камічныя… Так і ў мове: адно слова можа выражаць розныя значэнні.

Устанавіце адпаведнасць паміж значэннем слова *аснова* і прыкладамі яго ўжывання. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў (напрыклад, А1Б2В3Г4Д5Е7).

Улічыце, што кожнаму значэнню адпавядае толькі адзін прыклад ужывання.

*Максімальная колькасць балаў –* **6.**



| | |
|---|---|
| А. Частка прадмета (матэрыяльна выражаная), на якой замацоўваюцца астатнія яго часткі; каркас, касцяк. | 1. Тэатральныя прыступкі знаходзіліся амаль каля самай асновы калоны. |
| Б. Грунт ці штучнае збудаванне, на якім трымаецца, знаходзіцца што-небудзь; падмурак. | 2. У аснове гэтай п’есы ляжыць народная творчасць. |
| В. Тое, што складае ядро чаго-небудзь, з’яўляецца зыходным матэрыялам для ўтварэння, стварэння чаго-небудзь (перан.). | 3. У першым акце спектакля пра школу Шпак тлумачыў паняцце “аснова трохвугольніка”. |
| Г. Зыходныя, галоўныя палажэнні якой-небудзь навукі, тэорыі і пад. | 4. Касцюмеры падрыхтавалі для спектакля тканіну з сіняй асновай. |
| Д. Падоўжныя ніткі ў тканіне. | 5. У беларускай мове аснова слова спектакль невытворная. |
| Е. Частка слова, якая раскрывае яго лексічнае значэнне. | 6. Уздоўж сцэны рухаюцца ўперад асновы будучых дэкарацый. |
| | 7. Віктар Вардамацкі выкладаў ва ўніверсітэце асновы тэатразнаўства. |

**Заданне 3.** Злачынца замкнуў каштоўныя кнігі ў сейф. Каб адамкнуць яго, трэба разгадаць кодавае слова. На шчасце, у спешцы злачынца забыў на стале аркуш паперы, на якім запісана зашыфраванае слова. Дапамажыце адчыніць сейф і дастаць адтуль кнігі.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Гістарычныя перадумовы фарміравання тэатральнага дзейства з’яўляюцца ў першабытны перыяд. Як правіла, гэтыя абрады суправаджаліся загаворамі, песнямі, танцамі, ігрой на старажытных музычных інструментах. Важная роля адводзілася атрыбутам і адзенню ведзьмака або шамана, якія таксама стваралі гукавыя эфекты. Святы з элементамі тэатралізацыі ладзіліся ў гонар багоў, якія атаясамліваліся з сіламі прыроды.*

| | |
|---|---|
| А | Выпішыце прыставачнае слова, утворанае бяссуфіксным спосабам. |
| Б | Выпішыце слова, якое мае наступную марфемную будову: ¬ ⌒ ∧ □ (прыстаўка, корань, суфікс (не нулявы), канчатак). |
| В | Выпішыце слова, утворанае прыставачным спосабам. |
| Г | Выпішыце дзеяслоў, які мае два карані. |
| Д | Выпішыце слова, якое мае наступную марфемную будову: ¬ ¬ ⌒ ∧ ∧ □ ⌐ (прыстаўка, прыстаўка, корань, суфікс, суфікс, канчатак, постфікс). |
| Е | Паводле пачатковых літар кожнага з указаных у прыведзенай паслядоўнасці папярэдніх слоў павінна атрымацца слова, слова, адно са значэнняў якога – “катэгорыя грамадзян, якія прайшлі вайсковую службу і прызываюцца зноў у войска ў выпадку неабходнасці”. Запішыце гэта слова. Яно і будзе кодам для адкрыцця сейфа. |

**Заданне 4.** Займеннікі адыгрываюць важную тэкстаўтваральную ролю. Яны не толькі выконваюць уласцівую для іх замяняльную функцыю, але і ў значнай ступені дапамагаюць фарміраваць асноўную інфармацыю. Запоўніце табліцу на аснове выкарыстаных у прапанаваных сказах займеннікаў.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

А. Лічыцца, што найлепшая тэатральная прыкмета – знайсці цвік на сцэне. Гэта абяцае ў хуткім часе прапанову ролі акцёру. Многія артысты нават забіраюць знойдзеныя цвікі з сабой, лічачы, што так яны заўсёды будуць запатрабаваныя. Лучана Павароці ездзіў на ўсе канцэрты з вялікім жалезным цвіком, які падарыла яму мама.

Б. Гісторыя тэатра пачынаецца з таго часу, калі нашы продкі выконвалі свае рытуальныя танцы перад паляваннем. Народныя святы паступова перараслі ў прафесійныя пастаноўкі, без якіх нельга ўявіць ніякі сучасны народ.

В. Практыка запрашаць клакераў была яшчэ ў час Нерона, які лічыў сябе вялікім артыстам. Такая ж практыка была распаўсюджана і ў Еўропе ў XIX стагоддзі да таго часу, пакуль яны не сталі патрабаваць узнагароджанне за сваю працу.

Г. Гіганцкае "яйка" са шкла і тытану, нібы фантастычная падводная лодка, якая ўсплыла пасярод Пекіна, – не што іншае, як будынак сучаснага тэтра. Яго стваральнік, архітэктар, француз Поль Андрэ, даў волю сваёй фантазіі і зрабіў сапраўдны футурыстычны аб'ект.

**Заданне 5.** Уявіце, што фотавыставу "За кулісамі" Вы прапанавалі правесці 27 сакавіка – у Сусветны дзень тэатра. Да прапанаванай часткі сказа прыдумайце працяг, каб атрымаліся, калі магчыма, складаназалежныя сказы з рознымі відамі даданых частак. Калі гэта немагчыма зрабіць, то патлумачце прычыну. Запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

*Найлепшы дзень для арганізацыі фотавыставы "За кулісамі" – 27 сакавіка, ...*

**Заданне 6.** Прачытайце ўважліва тэкст. Уявіце сябе рэдактарам, якому трэба выправіць памылкі (магчыма, лексічныя, арфаграфічныя, граматычныя). У табліцу запішыце слова (спалучэнне слоў) з памылкай, выпраўце яе і патлумачце, чаму тут памылка.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

*Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі не толькі добра вядомы ў Беларусі, але і за яе межамі. Ён быў створаны ў 1990 годзе. Тэатр, апраўдваўшы сваё прызначэнне, вядзе індывідуальную работу з драматургамі, праводзіць рэпетыцыі, акторска-сцэнічныя чытанні п'ес па ролям, семінары з запрашэннем рэжысёраў і іншых спецыялістаў тэатра, спрые прафесійнаму стаўленню маладых аўтараў.*

*Значную цікавасць у тэатральнай грамадскасці выклікала дзейнасць Цэнтра беларускай драматургіі, які быў створаны пры тэатры ў 2007 годзе. У трупе ў гэты час працавалі 33 акцёры, у рэпертуары – 33 спектакля.*

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

В пьесе моей было тринадцать картин. Сидя у себя в комнатушке, я держал перед собою старенькие серебряные часы и вслух сам себе читал пьесу, очевидно, очень изумляя соседа за стенкой. Когда дочитал, вышло, что чтение занимает три часа. <…> Я вспомнил, что в спектаклях бывают и паузы. Так, например, стоит актриса и, плача, поправляет в вазе букет. Говорить она ничего не говорит, а время-то уходит. Стало быть, бормотать текст у себя дома – одно, а произносить его со сцены – совершенно иное дело.

*(М.Булгаков. Театральный роман).*

**Заданне 8.** Ва ўступным артыкуле да "Слоўніка тэатра" Патрыса Паві адзначалася, што "тэатр – закадзіраваная практыка, а расшыфроўка кодаў неабходная і вельмі займальная". Гэта немагчыма зрабіць без ведання тэатральных тэрмінаў і паняццяў. Разгадайце крыжаванку, дзе зашыфраваны некаторыя з іх.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

По гарызанталі: **1.** П'еса, заснаваная на непрымірымым канфлікце паміж высакароднай асобай і абставінамі, якія не даюць ёй магчымасці рэалізавацца; часта заканчваецца смерцю героя. **4.** Аўтар драматургічных твораў. **6.** Тэкст, які прамаўляе персанаж у ходзе дыялогу ў адказ на пытанне або думку іншага персанажа. **7.** Асоба, у абавязкі якой уваходзіць пастаноўка п'есы; гэта асоба бярэ на сябе адказнасць за эстэтычны бок спектакля і яго арганізацыю. **9.** Аўтарская заўвага ў тэксце драматургічнага твора, у якой даюцца тлумачэнні адносна таго, як выглядае, паводзіць сябе герой у дадзены момант, з дапамогай якіх рухаў, жэстаў, мімікі выяўляецца стан яго душы.

Па вертыкалі: **2.** Сукупнасць п'ес, якія выконвае адзін тэатр на працягу аднаго сезона або пэўнага перыяду. **3.** П'еса, у якой у смешным выглядзе паказваюцца найчасцей адмоўныя з'явы жыцця з мэтай іх крытыкі. **5.** Невялікая п'еса з займальнай інтрыгай, анекдатычным парадаксальным сюжэтам, песнямі, куплетамі, часам танцамі. **8.** Стварэнне на сцэне рознымі сродкамі (жывапіс, архітэктура і інш.) нагляднага вобраза дзеяння; сукупнасць элементаў тэатра для стварэння ілюзіі месца, дзе адбываецца дзеянне, што разыгрываецца на сцэне. **10.** Невялікая п'еса з элементамі грубаватых жартаў, надмернымі знешнімі камічнымі эфектамі, жаданнем паказаць чалавека ці падзею ў шаржыраваным, карыкатурным выглядзе. **11.** П'еса з вострым канфліктам сацыяльнага або побытавага характару, які развіваецца ў пастаянным напружанні. **12.** Асобная частка п'есы, вылучаная ў адпаведнасці з часам і развіццём дзеяння.



**Заданне 9.** Па рэпліках пазнайце персанажаў твораў беларускай драматургіі. Назавіце твор і яго аўтара

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| | |
|---|---|
| А | Не бойся, сястра! Я ліст, адарваны з таго самага дзерава, што і вы, што і многія мільёны падобных. Вецер свабодны прынёс мяне сюды, на вашую руіну. Хацеў бы з табой і з братам тваім аб важных справах пагаманіць. <…> І нічога, сястра, ведаць не трэба, а што трэба – я скажу, а ты гэта брату перадай... Слухай, сястра! Склікаецца сход вялікі, і ўсе браты і сёстры павінны на гэны сход з'явіцца. <…> Хто самахоць не пойдзе, над тым праклящце завісне, бо на сходзе жыццё мільёнаў будзе важыцца, а ў такіх вялікіх справах і адзін чалавек можа сабой сюды ці туды перацягнуць. |
| Б | Ну, хвала Богу, бацькоў удалося атуманіць! Цяпер трэба пайсці ў галаву па розум, каб дзеўку амарочыць. Прынадны, бач, кусочак. <…> Так, так! У цяперашнім разумным веку хочаш спакойна жыць? Будзь філосафам: бачыш – не бачыш, чуеш – не чуеш, – ба, ба, бы! |
| В | А ты ізноў сваё... Слухай, міленькая: ці ты надумалася зрабіць тое, аб што я цябе надовічы прасіў і маліў? Сама ж ты, золатца, казала мне не раз і цяпер кажаш, што татка твой ні на якія просьбы не згодзіцца. Значыцца, сама добра разумееш, што іншага выхаду для нас нямашака. А гэтак, як я казаў, будзе найлепей. Ці то мы будзем першыя, або апошнія? Янка Лукашонак з сваёй Зосяй так зрабілі, Ігнась Манякоўскі з сваёй Дамінісяй, ды і шмат хто... Бацькі спачатку пазлуюць, пазлуюць трохі і адпусцяцца,– ведама, бацькаўскае сэрца. Вось мы з табой, міленькая, такім парадкам самі сабе шчасце збудуем і нічыёй ласкі прасіць не будзем. Адно, абы твая згода – і ўсё будзе добра. Я ўжо, прызнацца табе, гаварыў з папом. Ён заўтра прыязджае ў Міхалішкі імшу адпраўляць і заначуе ў ваколіцы. Ну, а мы к яму... раз, два і – гатова. |
| Г | І я вас прашу, ваша благародзіе, – пусць подадут міровую і канцы в воду. <…> Харашо быць пісьмавадзіцелем у разумнага чалавека, маляваныя госцікі! (*Паказваючы на бумажку.*) Самі ў карман лезуць, не нада і рук выцягваць. (*Да Ціхона.*) Не ведаю, што рабіць! Ён сам баіцца, каб, зрабіўшы вам палёгку, перад судом не адказваць. Але папробуйце. <…> Злажыце яму добры гасцінчык, авось паквапіцца? Пагаварыце з сабою і злажыце, а я, тым часам, папрабую ўгаманіць яго. |

**Заданне 10.** Уявіце, што Вы драматург. Сёння вельмі модна выкарыстоўваць у якасці дзейных асоб ужо вядомых літаратурных герояў. Напішыце невялічкую п'есу на адзін акт (не больш за 12 рэплік) пра сустрэчу Надзеі Яноўскай і жонкі Усяслава Грынкевіча. Назавіце, з якіх твораў гэтыя персанажы, хто з'яўляецца іх аўтарам. Не забывайце, што класічная п'еса павінна мець назву і яшчэ некалькі элементаў.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*